# КНІГА ЭКЛЕЗІЯСТА

1 Слова Эклезіяста, сына Давідавага, цара ў Ерусаліме.
2 Пустая марнасьць сказаў Эклезіяст, пустая
марнасьць, - усё марнасьць!
3 Якая карысьць чалавеку ад усёй працы ягонай, якую
ён робіць пад сонцам?
4 Пакаленьне прыходзіць, і пакаленьне праходзіць, а
зямля векавечна стаіць.
5 Сонца ўзыходзіць, і сонца заходзіць і сьпяшаецца ў
месца сваё, дзе ўстае.
6 Вее вецер на поўдзень і на поўнач вяртаецца, віруе,
віхурыцца веючы, і на шлях віраваньня вяртаецца
вецер.
7 Рэкі ўсе ў мора плывуць, а мора не перапаўняецца;
да месца таго, адкуль рэкі плывуць, вяртаюцца зноў,
каб далей пацячы.
8 Усё існае - поўніцца працай; ня можа ўсяго чалавек
пакласьці на словы: не насыціцца бачаньнем вока; не
напоўніцца слуханьнем вуха.
9 Што было, тое і будзе; што рабілася, тое й
рабіцьмецца, і нічога новага пад сонцам няма.
10 Бывае такое, пра што людзі кажуць: «Дзівіся, вось
гэта новае»; але яно ўжо было спрадвеку, да нас.
11 Няма памяці пра былое; ды і пра тое, што будзе, не
застанецца згадкі між тымі, што прыйдуць пасьля.
12 Я, Эклезіяст, быў царом над Ізраілем у Ерусаліме.
13 І паклаў я на сэрца помысел мой, каб шукаць і
дасьледаваць мудрасьцю ўсё, што пад небам робіцца:
гэты прыкры занятак даў Бог сынам чалавечым, каб
кіраваліся ім.

14 Я ўсе дзеі пабачыў, якія пад сонцам чыняцца, і вось,
усё - марнасьць і пагоня за ветрам!
15 Крывое ня выпрастаецца, і чаго няма, таго нельга
зьлічыць.
16 Гаварыў я з сэрцам маім і сказаў: вось,
узьвялічыўся я і здабыў мудрасьці болей за ўсіх,
што былі да мяне над Ерусалімам, і сэрца маё шмат
нагледзела мудрасьці ўсякай і ведаў.
17 І паклаў я на сэрца помысел мой, каб мудрасьць
уведаць, спасьцігнуць шаленства і неразумнасьць;
спазнаў, што і гэта - пагоня за ветрам.
18 Бо пры многасьці мудрасьці множыцца й скруха; і
хто памнажае спазнаньне, той памнажае і боль.

# Экл 2

1 І сказаў я ў сэрцы маім: «Ану ж бо праверу цябе я
радасьцю, і нацешуся дабром»; але ж гэта - марнота!
2 Пра сьмех я сказаў: «Недарэчнасьць!», а пра
радасьць: «Што яна дасьць?»
3 Намысьліў я ў сэрцы маім падбадзёрваць віном
маё цела і, тым часам як сэрца маё кіравацьмецца
мудрасьцю, ня цурацца і дурасьці, пакуль не пабачу,
што добра сынам чалавечым, што маюць яны рабіць
пад небам за кароткія дні свайго веку.
4 Учыніў я вялікія дзеі: дамы я сабе збудаваў, насадзіў
сабе вінаграднікі;
5 завёў сабе сады і гаі, насадзіў у іх розных пладовых
дрэў;
6 нарабіў сабе сажалак, каб паліваць зь іх гаі, у якіх
дрэвы растуць;
7 наняў сабе слуг і служанак, і дамачадцы былі ў
мяне; а таксама буйной і дробнай худобы было ў мяне
болей, чым ва ўсіх, што жылі да мяне ў Ерусаліме;

8 сабраў сабе срэбра і золата й скарбаў каштоўных ад цароў і правінцый; завёў у сябе сьпевакоў і сьпявачак і асалоду сыноў чалавечых - мноства жонак і наложніц.
9 І ўзьвялічыўся я і ўзбагацеў над усімі, што жылі да мяне ў Ерусаліме; і мудрасьць мая засталася пры мне.
10 І нічога, чаго вочы мае ні прагнулі, я ім не адмовіў; ад ніводнае радасьці сэрца майго ня ўхіліў, бо сэрца маё суцяшалася кожнаю працай маёю; і гэта было маёй доляй ва ўсіх маіх працах.
11 І калі я зірнуў на ўсе дзеі мае, якія ўчыняў я сваімі рукамі, на працу, якую рабіў я: і вось, усё - марнасьць і пагоня за ветрам, і ніякай карысьці пад сонцам.
12 Пастанавіў я сабе пабачыць і мудрасьць, шаленства і дурасьць. Бо што зробіць пасьля цара чалавек звыш таго, што зроблена ўжо?
13 І ўбачыў я, што мудрасьць пераважае над дурасьцю так, як сьвятло над цемраю.
14 У мудрага вочы яго - у галаве яго, а бязглузды ходзіць у цемры. І даведаўся я таксама, што аднолькавая спаткае ўсіх доля.
15 І сказаў я ў сэрцы маім: «І мяне спасьцігне такая самая доля, як і дурнога: навошта ж я надта мудры зрабіўся?» І сказаў я ў сэрцы маім, што і гэта - марнасьць.
16 Бо мудрага помніць ня будуць вечна, як і дурнога; у днях наступных забудзецца ўсё, і памірае мудры гэтаксама, як і бязглузды.
17 І зьненавідзеў жыцьцё я: бо апрыкралі мне ўсе ўчынкі, якія пад сонцам зьдзяйсьняюцца; бо ўсё - пустая марнасьць і пагоня за ветрам!
18 І зьненавідзеў усю маю працу, якую рабіў я пад сонцам; бо мушу пакінуць яе чалавеку, які прыйдзе пасьля мяне.
19 І хто ведае: мудры ён будзе альбо дурны? А

валодаць ён будзе ўсёй працай маёю, якую рабіў я
і ў якой паказаў сябе мудрым пад сонцам. І гэта -
марнасьць!
20 І спаняверыўся я і ўмаўляў маё сэрца адцурацца ад
працы ўсяе, якую рабіў я пад сонцам:
21 Бо бывае такі чалавек, які ў працы і мудры, і
ўдзельны, і плённы, а павінен пакінуць усё чалавеку,
які над тым не працаваў. І гэта - марнасьць і вялікае
ліха!
22 Бо што будзе мець чалавек ад працы сваёй і клопату
сэрца свайго, якімі мазоліцца ён пад сонцам?
23 Бо ўсе яго дні - пакуты, і праца ягоная - смутак;
нават і ўночы сэрца яго спакою ня мае. І гэта -
марнасьць!
24 Няма чалавеку ўлады над тою даброцьцю, каб есьці
і піць і каб душа мела радасьць ад працы ягонай. Я
ўбачыў: і гэта - з рук Божых.
25 Бо хто можа есьці і хто безь яго можа цешыцца з
асалодаў?
26 Бо чалавеку, які перад абліччам Ягоным ёсьць
добры, Ён мудрасьць дае, і веды, і радасьць; а
грэшнаму клопат дае - зьбіраць, назапашваць, каб
богаспадобнаму потым аддаць. І гэта - марнасьць і
пагоня за ветрам!

# Экл 3

1 Усё мае сваю пару, і гадзіна кожнае дзеі - пад небам.
2 Ёсьць пара нарадзіцца, і пара памерці, пара
насаджаць, і пара вырываць пасаджанае.
3 Пара забойства, і пара гаеньня; пара разбураць, і
пара будаваць;
4 пара плачу, і пара весялосьці; пара бедаваць, і пара
танцаваць;

5 пара раскідаць камяні, і пара зьбіраць камяні; пара
абдымаць, і пара ўхіляцца абдоўмаў;
6 пара шукаць, і пара губляць; пара ашчаджаць, і пара
выкідаць;
7 пара разьдзіраць, і пара зашываць; пара маўчаць, і
пара прамаўляць;
8 пара кахаць, і пара ненавідзець; пара вайне, і пара
міру.
9 Якая карысьць таму, хто працуе, з таго, над чым ён
працуе?
10 Бачыў я гэты клопат, які Бог даў сынам чалавечым,
каб мелі сабе турботу.
11 Усё Ён цудоўным зрабіў сваёю парою і вечнасьць
паклаў ім у сэрца, хоць ня кемяць яны ў тых справах,
што Бог учыніў, ад пачатку і да канца.
12 Уведаў я, што няма ім нічога лепшага, як весяліцца
і ў жыцьці сваім добрае толькі ўчыняць.
13 І калі які чалавек есьць і п'е і бачыць дабро ва
ўчынках сваіх, дык гэта - дар Божы.
14 Уведаў я, што ўсё, што робіць Бог, застаецца навекі;
Ён робіць так, каб багавейна ступалі перад абліччам
Яго.
15 Што было, тое ёсьць і цяпер, і што будзе, тое было
ўжо; і пакліча Бог мінулае.
16 Яшчэ я пад сонцам пабачыў: месца суду - а там
беззаконьне; месца праўды - а там няпраўда
17 І сказаў я ў сэрцы маім: «Судзіць будзе Бог
праведнага і грэшнага; бо на кожную справу
прызначана пара і суд на кожную дзею тваю».
18 Сказаў я ў сэрцы маім сынам чалавечым, каб Бог іх
выпрабаваў і каб убачылі яны, што самі ў сабе яны -
жывёлы:
19 бо доля ў сыноў чалавечых і доля ў жывёлін - доля
адна; як паміраюць тыя, так паміраюць і гэтыя, і адно

дыханьне ва ўсіх, і няма ў чалавека над жывёлінаю
перавагі, бо ўсё - марнасьць!
20 Усё ідзе ў адно месца; усё выйшла з тла, і ўсё
вяртаецца ў тло.
21 Хто ведае: ці дух сыноў чалавечых падымаецца
ўгору, а ці дух жывёл апускаецца долу, у зямлю?
22 І вось убачыў я, што няма нічога лепшага чалавеку,
як радавацца з учынкаў сваіх: бо гэта - доля яго; хто
ж бо яго прывядзе паглядзець на тое, што пасьля яго
будзе?

# Экл 4

1 І прыгледзеўся зноў я, і ўгледзеў уціскі ўсялякія, што
пад сонцам здараюцца: і вось сьлёзы прыгнечаных, а
суцешніка ў іх няма; і ў руцэ ў прыгнятальнікаў іхніх
- сіла, а суцешніка ў іх няма.
2 І прызнаў я шчасьлівымі мёртвых, якія памерлі
даўно, больш, чым жывых, што дагэтуль жывуць;
3 а шчасьлівейшы той за абодвух, хто яшчэ не
радзіўся, хто ня бачыў яшчэ ліхадзействаў, якія пад
сонцам вядуцца.
4 І зноў я пабачыў, што ўсякая праца і посьпех
усякі ў справах узаемную зайздрасьць паміж людзьмі
спрычыняюць. І гэта - марнасьць і пагоня за ветрам!
5 Неразумны сядзіць, склаўшы рукі свае, і жарэ сваё
цела.
6 Лепей жменя спакою за поўныя прыгаршчы клопату
і пагоню за ветрам.
7 І зірнуў я, і зноў убачыў марнасьць пад сонцам:
8 самотнік, і ня мае нікога ён іншага: ні сына, ні брата
няма ў яго; і ня мае канца ён турботам сваім, і не
насыціцца вока яго багацьцем. «На каго ж я працую, і
даброцяў душу сваю пазбаўляю?» І гэта - марнасьць і
прапалая справа!

9 Дваім лепей, чым аднаму, бо ёсьць ім добрая дзяка
за іхнюю працу.
10 Бо, як адзін упадзе, падыме другі свайго сябра!
Але гора таму, хто адзін упадзе, а другога няма, хто
падняў бы яго.
11 Гэтак сама, як двое ляжаць, дык ім цёпла; а дзе
аднаму прыгрэцца?
12 І калі б хто напаў на другога, дык выстаяць двое
супраць таго. І нітка, ссуканая з трох, ня скора
парвецца.
13 Лепей бедны, ды разумны хлапчына, чым стары, ды
неразумны цар, які рады ня слухае.
14 Бо той зь вязьніцы выйдзе на царства, хто
нарадзіўся ў царстве сваім бедным.
15 Бачыў я ўсіх жывых, што ходзяць пад сонцам, з
гэтым другім юнком, які зойме месца таго.
16 Ня было ліку ўсяму люду, які быў перад ім, хоць
і наступныя радасьці ў ім ня мецьмуць. І гэта -
марнасьць і пагоня за ветрам!
17 Сачы за нагою тваёю, калі ідзеш у дом Божы, і
будзь гатовы больш слухаць, чым ахвяры прыносіць;
ня думаюць бо яны, што благое ўчыняюць.

# Экл 5

1 Ня будзь на язык надта борзды, і сэрца тваё хай
ня будзе сьпяшацца сказаць перад Богам слова, таму
што Бог на небе, а ты на зямлі! Таму слова тваё хай
ашчаднае будзе.
2 Бо як сны бачацца ад вялікае працы, так голас
дурнога пазнаецца па пустаслоўі.
3 Калі даеш абяцаньне Богу, не замаруджвай
выконваць яго, бо ня мае Ён упадабаньня да
неразумных: што абяцаўся - зрабі.
4 Лепей табе не абяцацца, чым абяцаць і не зрабіць.

5 Не дазваляй тваім вуснам уводзіць у грэх тваё цела
і не кажы перад анёлам Божым: «гэта - памылка!»
Навошта табе, каб загневаўся Бог на слова тваё і
зруйнаваў дзеі рук тваіх?
6 Бо ў мроіве сноў, як і ў мроіве слоў - марнасьці шмат;
а ты бойся Бога.
7 Калі ты ўбачыш у якім-небудзь краі ўціскі беднаму
і парушэньне суду і праўды, дык ня зьдзіўляйся з
гэтага, бо за высокім назірае вышэйшы, а над імі яшчэ
вышэйшы;
8 а найвышэйшасьць краіны ёсьць цар, які дбае за ўсю
краіну.
9 Хто любіць срэбра, той не насыціцца срэбрам, і хто
любіць багацьце, ня мае карысьці зь яго. І гэта -
марнасьць!
10 Калі множыцца маёмасьць, множацца і тыя, што
яго спажываюць; і якая карысьць яго ўласьнікам: хіба
толькі сваімі вачмі сузіраць?
11 Салодкі сон у таго, хто працуе, ці мала ён есьць, а ці
многа; а сытасьць багатаму спаць не дае.
12 Ёсьць нядоля балючая, якую я пад сонцам бачыў:
багацьце, якое ўласьнік пільнуе на шкоду сабе.
13 І гіне багацьце яго ад няшчасных выпадкаў:
нарадзіў ён сына, а нічога няма ў руках у яго.
14 Як выйшаў ён голы з улоньня маці сваёй, такі і
адыдзе, якім прыйшоў, і нічога ня возьме ад працы
сваёй, што мог бы панесьці ў руцэ сваёй.
15 І гэта нядоля балючая: які ён прыйшоў, такі
адыходзіць. Якая ж карысьць яму, што працаваў ён
на вецер?
16 А да таго ўсе дні свае еў ён у цемры, у вялікай
дакуцы, скрусе й маркоце.
17 Вось яно, што я добрага і прыемнага бачыў: есьці
і піць і добрае бачыць ва ўсёй сваёй працы, якую ён

робіць пад сонцам ва ўсе дні свайго веку, якія даў яму
Бог; бо гэта - ягоная доля.
18 І калі якому чалавеку Бог даў багацьце і маёмасьць,
і даў яму ўладу іх спажываць і браць сваю частку ад
працы сваёй, дык гэта - дар Божы.
19 Ня многа бо дзён жыцьця свайго мецьме на памяці;
таму яго Бог адарае радасьцю сэрца ягонага.

# Экл 6

1 Ёсьць зло, якое я ўбачыў пад сонцам, і багата яго між
людзьмі:
2 Бог дае чалавеку багацьце, і маёмасьць, і славу, і
душы ягонай ніякай нястачы няма ані ў чым, чаго
зажадае; ды ня даў яму Бог карыстацца з таго, а чужы
чалавек спажывае: гэта - марнасьць і ліхая нядоля!
3 Калі б сотню дзяцей нападзіў чалавек і пражыў
шмат гадоў і памножыліся дні яго веку, а душа яго
ўцехі ня мела б з дабротаў і каб ня было яму і
пахаваньня, я сказаў бы: неданосак шчасьлівейшы за
яго,
4 бо дарма ён прыйшоў і ў цемру сышоў, і імя яго
ўкрылася змрокам:
5 ані сонца ня бачыў і не спазнаў: яму спакайней, чым
таму.
6 А той, хоць пражыў бы дзьве тысячы год і не
насыціўся б дабром, ці ж не ў адно і тое месца ідзе?
7 Уся праца людская - для рота, а душа чалавека - не
насычаецца.
8 Якая ж перавага ў мудрага над неразумным, якая - у
гаротніка, што ўмее хадзіць, над тымі, што жывуць?
9 Лепей бачыць вачыма, чым душою блукаць. А гэта -
таксама марнасьць і пагоня за ветрам!
10 Што існуе, таму дадзена ўжо найменьне, і вядома,
што гэта - чалавек і што ня можа ён прававаца з тымі,
якія мацнейшыя за яго.

11 Шмат ёсьць такога, што памнажае марнасьць: што
ж чалавеку лепей?
12 Бо хто ведае, што чалавеку добра ў жыцьці, у
безьлічы дзён марнага веку яго, якія праходзяць, бы
цень? І хто чалавеку скажа, што будзе пад сонцам
пасьля яго?

# Экл 7

1 Імя добрае лепш за масьць дарагую, а дзень сьмерці
- за дзень нараджэньня.
2 Лепей хадзіць у дом жалобы па мёртвым, чым
у харомы банкету; бо такі ёсьць канец усякаму
чалавеку, і жывы бярэ гэта да сэрца свайго.
3 Смутак лепшы за сьмех; бо пры скрусе аблічча сэрца
робіцца лепшым.
4 Сэрцы мудрых - у доме плачу а сэрцы бязглуздых - у
доме вясёлым.
5 Лепей слухаць дакоры ад мудрага, чым слухаць
пахвалы ад неразумных;
6 бо сьмех неразумных ёсьць тое, што й трэск сухога
ядлоўцу пад горшчыкам. І гэта - марнасьць!
7 Уціскаючы іншых, разумны дурнее, і хабар сэрца
псуе.
8 Канец працы лепшы за пачатак яе; цярплівы лепшы
за пыхлівага.
9 Не сьпяшайся да гневу духам тваім, бо гняздуецца
гнеў у сэрцы бязглуздых.
10 Не кажы: «чаму гэта колісь было лепей, чым
сёньня?» - не зь вялікага розуму ты папытаўся пра
гэта.
11 Добрая мудрасьць - як і добрая спадчына, асабліва
ж бо тым, што сонца бачаць:
12 бо пад шатамі мудрасьці, як пад шатамі срэбра;
а перавага пазнаньня ў тым, што мудрасьць жыцьцё
зьберагае таму, хто яе мае.

13 Прыгледзься да дзеяў Божых: хто можа выправіць
тое, што Ён зрабіў крывым.
14 У добрыя дні карыстайся з дабротаў, а ў ліхія дні
разважай: і тое і іншае стварыў Бог, каб ня мог
чалавек нічога сказаць пасьля сябе.
15 Нагледзеўся я ў дні марноты сваёй усялякага
ўдосыць: справядлівы гіне ў сваёй справядлівасьці;
бязбожны доўга жыве ў бязбожнасьці сваёй.
16 Ня будзь лішне строгі, і не выстаўляйся залішне
мудрым; навошта табе нішчыць сябе?
17 Не ўпадай у грахі і ня будзь шалёны; навошта табе
паміраць заўчасна?
18 Добра, калі трымацьмешся толькі аднога і не
адымеш рукі ад другога; бо хто богабаязны, той
пазьбегне ўсяго благога.
19 Мудрасьць робіць мудрага мацнейшым за дзесяць
уладароў, якія ў горадзе.
20 Няма чалавека справядлівага на зямлі, які рабіў бы
дабро і не грашыў;
21 таму не на ўсякае сказанае слова зважай, каб не
пачуць табе, як твой раб цябе ганіць.
22 Бо многа выпадкаў ведае сэрца тваё, калі сам ты
ганіў іншых.
23 Я ўсё гэта мудрасьцю выпрабаваў; я сказаў: «буду я
мудры»; але мудрасьць далёка ад мяне.
24 Далёка тое, што ёсьць, і глыбока-глыбока: хто
дастане яго?
25 І паклаў я на сэрца помысел мой, каб дазнацца,
дасьледаваць, і знайсьці мудрасьць і розум, і каб
ведаць бязбожнасьць дурноты, невуцтва і шаленства.
26 І знайшоў я, што горш за сьмерць жанчына, таму
што яна - сетка, і сэрца ў яе - пастка, рукі ў яе -
кайданы; любасны Богу ўратуецца ад яе, а грэшніка

схопіць яна.
27 Вось гэта знайшоў я, сказаў Эклезіяст,
выпрабоўваючы адно за адным.
28 Чаго яшчэ шукала душа мая, і я не знайшоў?
Мужчыну аднаго з тысячы я знайшоў, а жанчыны
сярод іх усіх не знайшоў.
29 Толькі гэта знайшоў я, што Бог стварыў чалавека
праведнага, а людзі кінуліся ў вымудры ўсякія.

# Экл 8

1 Хто ёсьць - як мудрэц, і хто разумее значэньне
слова? Мудрасьць прасьвятляе чалавеку аблічча яго,
і суровасьць твару яго зьмяняецца.
2 Я кажу: трымайся царскага слова, і гэта дзеля
прысягі перад Богам.
3 Не сьпяшайся ўхіляцца аблічча яго і не зацінайся ў
слове благім; бо ён усё можа зрабіць, што захоча.
4 Дзе слова цара, там улада, і хто яму скажа: «што ты
робіш?».
5 Хто выконвае запаведзь, той не зазнае нічога ліхога.
Сэрца мудрага ведае час і ўправу;
6 бо на ўсякую рэч ёсьць свая пара і ўправа; а чалавеку
вялікае ліха з таго,
7 бо ня ведае ён, што будзе; і як яно будзе - хто скажа
яму?
8 Чалавек ня мае ўлады над духам, каб дух утрымаць,
і няма ў яго ўлады над сьмертнай часінай, і
няма збаўленьня ў гэтым змаганьні, і не ўратуе
бязбожнасьць бязбожніка.
9 Усё гэта бачыў я і да сэрца майго браў усякую справу,
якая пад сонцам чыніцца. Бывае час, калі чалавек
валадарыць над чалавекам на шкоду яму.
10 Бачыў тады я, што хавалі бязбожных, і прыходзілі
ў магілу, і адыходзілі далёка ад сьвятога месца, і

забывалі ў горадзе іх, што жылі праведна. І гэта - марнасьць!
11 Няскора ўчыняецца суд над благімі справамі; таму не баіцца сэрца сыноў чалавечых чыніць ліхату.
12 Хоць сто разоў робіць грэшнік ліхое і зацінаецца ў тым, але ведаю я, што добра будзе богабаязным, якія перад абліччам Ягоным стаяць багавейна;
13 а бязбожнаму добра ня будзе, і як цень, нядоўга стаяцьме той, хто перад Богам не багавейны.
14 Ёсьць на зямлі і такая марнота: праведнага спасьцігае тое, чаго заслугоўваюць дзеі бязбожных, а зь бязбожнымі чыніцца тое, чаго заслугоўваюць дзеі праведнікаў. І сказаў я: і гэта - марнасьць!
15 І ўславіў я радасьць; бо няма лепшага чалавеку пад сонцам, як есьці, піць і радавацца; гэта ідзе зь ім у працы ў дні жыцьця яго, якія даў яму Бог пад сонцам.
16 Калі паклаў я на сэрца помысел мой, каб мудрасьць спазнаць і пабачыць справы, што робяцца на зямлі і сярод якіх чалавек ані ўдзень, ані ўночы спачыну ня мае:
17 тады я і ўбачыў усе дзеі Божыя і зразумеў, што ня можа чалавек спазнаць дзеі пад сонцам. Колькі б ні працаваў чалавек, каб дашукацца, а не зразумее таго; і калі б сказаў які-небудзь мудрэц, што ён ведае, - а ня здолее ён даўмецца да таго.

# Экл 9

1 Усё гэта ў сэрца я ўзяў, каб дазнацца, што праведнікі і грэшнікі і іх учынкі - у Божай руцэ і што чалавек ні любові ні злосьці ня знае ва ўсім, што перад ім.
2 Усяму і ўсім - адно: адна доля праведніку і бязбожнаму, добраму і ліхому, чыстаму і нячыстаму, таму, хто прыносіць ахвяры, і таму, хто ахвяр ня прыносіць; як дабрачыннаму, так і грэшнаму; як

таму, хто прысягаецца, так і таму, хто цураецца
клятвы.
3 Вось гэта ёсьць ліха ва ўсім, што пад сонцам
робіцца, што адна доля ўсім, і сэрца сыноў чалавечых
напоўнена злом, і неразумнасьць у сэрцы ў іх, у
жыцьці іхнім; а потым яны адыходзяць да мёртвых.
4 Хто сярод жывых, той мае яшчэ надзею, бо і сабаку
жывому лепей, чым мёртваму льву.
5 Жывыя ведаюць, што памруць, а мёртвыя нічога ня
ведаюць, і ўжо ім аддзякі няма, бо і памяць пра іх
адышла ў забыцьцё,
6 і любоў іхняя, і нянавісьць іхняя, і зайздрасьць іхняя
ўжо зьніклі, і няма болей учты ім вавекі ні ў чым, што
пад сонцам робіцца.
7 Дык вось, ідзі, з радасьцю еж твой хлеб, у радасьці
сэрца пі віно тваё, калі будзе на справы твае добрая
Божая воля.
8 Хай сьветлай будзе ва ўсякую пору адзежа твая і хай
не абсохне алей на тваёй галаве.
9 Радуйся жыцьцю з жонкай тваёю, якую кахаеш, ва
ўсе часіны жыцьця твайго марнага, якое даў табе Бог
пад сонцам на ўсе дні твайго марнага веку; бо гэта -
доля твая ў жыцьці і ў працы тваёй, якую ты робіш пад
сонцам.
10 Усё, што можа зрабіць твая рука, па сіле рабі;
бо ў магіле, у якую ты ляжаш, няма ні працы, ні
разважаньня, ні ведаў, ні мудрасьці.
11 І зноў я пабачыў пад сонцам, што ня ўвішным
пасьпяховы бег дастаецца, не адважным - перамога,
ня мудрым - хлеб, і не ў разумных - багацьце, і
ня ўмельцам - прыхільнасьць, а ад пары й нагоды
залежаць яны.
12 Бо чалавек сваёй пары ня знае. Як рыбы ловяцца
ў згубную сетку, як птушкі ў сілах заблытваюцца,
так сыны чалавечыя за ліхі час хапаюцца, калі ён

раптоўна находзіць на іх.
13 Яшчэ вось якую мудрасьць пад сонцам я ўгледзеў, і
яна мне здалася важнаю:
14 горад невялікі, і людзей у ім небагата; падступіўся
да яго вялікі цар, і атачыў яго шчыльна, і падрыхтаваў
супроць яго аблогу;
15 але знайшоўся ў ім мудры бядняк, і ён выратаваў
мудрасьцю горад; але ж потым ніхто не згадаў таго
бедака.
16 І сказаў я: мудрасьць лепшая за сілу, але мудрасьць
бедняка заняхайваецца, і словаў ягоных ня слухаюць.
17 Словы мудрых, спакойныя, выслухоўваюцца лепей,
чым крык валадара сярод дурняў.
18 Мудрасьць лепшая за вайсковую зброю; але адзін
грэшнік загубіць многа дабра.

# Экл 10

1 Мёртвыя мухі псуюць і смуродзяць пахучую
масьць міраварніцы, тое самае робіць малая дурнота
шаноўнага чалавека зь яго мудрасьцю й гонарам.
2 Сэрца мудрага - праваруч, а сэрца бязглуздага -
леваруч.
3 І па дарозе, калі дурань ідзе, не стае яму глузду, і
кожнаму пакажа, што ён дурны.
4 Калі ўспыхне начальніцкі гнеў на цябе, не
пакідай свайго месца; бо рахманасьць даводзіць
да дараваньня вялікіх правінаў.
5 Ёсьць зло, якое бачыў я пад сонцам, падобнае да
памылкі, якая ад валадара паўстала:
6 на вялікіх вышынях, бывае, сядзіць дурнота, а
багатыя нізка садзяцца;
7 бачыў я конных рабоў, а князёў, што пеша, нібы
рабы, хадзілі.

8 Хто яму капае, той у яе і ўпадзе, і хто разбурае агароджу, таго ўкусіць зьмяя.
9 Хто зносіць каменьне, той можа сябе надсадзіць, і хто коле дровы, той мае пагрозу ад іх.
10 Калі прытупляецца сякера і хтось ляза не навострыць, шмат намогі дадаць давядзецца; перавага плённае дзеі - мудрасьць.
11 Калі гадзіна ўкусіць без заклінаньня, дык ня лепшы за яе і злоязыкі.
12 Слова з вуснаў мудрага - мілата, а вусны дурнога яго ж і нішчаць:
13 пачатак слоў зь яго вуснаў - глупства, а канец яго казані з вуснаў - шаленства.
14 Дурны шмат чаго нагаворыць, хоць ня ведае чалавек, што будзе, і хто скажа яму, што пасьля яго станецца?
15 Праца дурнога стамляе яго, бо ён і ня ведае нават дарогі да горада.
16 Гора табе, зямля, калі цар твой - дзіця і калі ўладыкі твае ядуць рана!
17 Шчасьце табе, зямля, калі цар твой з высокага роду і ўладыкі твае ядуць у назначаны час, каб мацавацца, а не разьядацца!
18 Ад гультайства і столь прасядае; і як апусьцяцца рукі, дык дом пацячэ.
19 Гасьціны спраўляюць для асалоды, і віно зьвесяляе жыцьцё; а за ўсё адказвае срэбра.
20 Нават і ў думках тваіх не ліхаслові цара, і ў спальні тваёй не ліхаслові багатага; бо і птушка нябесная можа словы твае перанесьці, а крылатая - казань тваю пераказаць.

# Экл 11

1 Хлеб свой пускай па вадзе, час міне, і зноў знойдзеш яго.

2 Давай частку на сем і нават на восем, бо ня ведаеш,
якая нагода чакае зямлю.
3 Як напоўняцца хмары, яны выльюць дождж на
зямлю; і як паваліцца дрэва на поўдзень, на поўнач,
так і ляжацьме, як яно ўпала.
4 Хто зважае на вецер, той сеяць ня будзе; і хто
паглядае на хмары, ня будзе той жаць.
5 Як ня ведаеш ты дарогі вятроў і таго, як ствараюцца
косьці ва ўлоньні ў цяжарнай, так ня можаш ты ведаць
і дзеяў Бога, Які робіць усё.
6 Раніцай сей насеньне твaё і ўвечары не давай
адпачынку руцэ; бо ня ведаеш ты, ці тое, ці
іншае дасьць большы плён альбо тое і іншае будзе
аднолькава добра.
7 І сьвятло салодкае, і добра вачам бачыць сонца.
8 Калі чалавек пражывае многа гадоў, хай весяліцца
ўвесь час праз гады, і хай памятае пра цёмныя дні,
якіх будзе шмат: усё, што будзе, - марнасьць!
9 Весяліся, хлопча, у юнацтве тваім, і хай сэрца твaё
вясёлае будзе ва ўсе дні маладосьці тваёй, і хадзі
пуцявінамі сэрца твайго і сьветлым бачаньнем вачэй
тваіх; толькі ведай, што за ўсё гэта Бог пакліча на суд.
10 І смутак гані ад сэрца твайго, і адпрэчвай благое ад
цела твайго, бо маладосьць і маленства - марнасьць!

# Экл 12

1 І памятай Творцу твайго ў дні юнацтва твайго,
пакуль ня прыйшлі цяжкія дні і гады не насталі, пра
якія ты будзеш казаць: «няма мне ад іх асалоды!»,
2 пакуль не патухлі сонца, і сьвятло, і месяц, і зоркі і
не насунуліся новыя хмары пасьля дажджу.
3 У той дзень, калі задрыжаць тыя, што дом ацаляюць,
і сагнуцца мужы сілы; і перастануць малоць тыя, што

мелюць, бо няшмат ужо іх засталося; і зацьмяцца тыя, якія глядзяць у акно;
4 і замыкацца будуць дзьверы на двор; калі аціхне гул жорнаў, і будзе ўставаць чалавек на пеўнеў крык, і замоўкнуць дочкі пяяньня;
5 і вышыні іх будуць палохаць, і на дарозе жахі; і міндаль зацьвіце, і ў траве зьнярухомее конік, і рассыплецца каперс, - бо адыходзіць чалавек у вечны свой дом, і гатовыя абступіць яго плакальшчыцы на дарозе;
6 пакуль не парваўся срэбраны ланцужок, і не разьбілася залатая чаша, і не разьбіўся збанок ля крыніцы, і не абвалілася кола над студняй.
7 І вернецца тло ў зямлю, чым і было яно; і вернецца дух да Бога, Які даў яго.
8 Наймарнейшая марнасьць, сказаў Эклезіяст, усё - марнасьць!
9 Акрамя таго, што Эклезіяст быў мудры, ён вучыў яшчэ народ ведам. Ён усё выпрабоўваў, дасьледаваў і склаў многа выслоўяў.
10 Стараўся Эклезіяст вышукваць зграбныя выслоўі і словы праўды напісаў слушна.
11 Словы мудрых - што іголкі, як убітыя цьвікі, і складальнікі іх - ад адзінага пастыра.
12 А што звыш усяго гэтага, сыне мой, таго асьцерагайся: складаць многа кніг - канца ім ня будзе, і многа чытаць - стамляецца цела.
13 Выслухаем сутнасьць усяго: бойся Бога і запаведзяў Ягоных трымайся, бо чалавеку ў гэтым - усё.
14 Бо ўсякі ўчынак Бог прывядзе на суд і ўсё таемнае, ці яно добрае, а ці благое.

# Біблія (пераклад В.Сёмухі)
# The Holy Bible in Belarusan
## Белорусское Новый Завет и Притчи

copyright © 2016 John the Forerunner Church of Christians of Evangelical Faith of Minsk City

Language: Belarusian

Translation by: Antoni Bokun

Contributor: John the Forerunner Church of Christians of Evangelical Faith of Minsk City

This translation is made available to you under the terms of the Creative Commons Attribution-No Derivatives license 4.0.
You may share, redistribute, or adapt this Bible translation or extracts from it in any format, provided that:

You include the above copyright and source information.

You do not use this work for commercial purposes.

Pictures included with Scriptures and other documents on this site are licensed just for use with those Scriptures and documents. For other uses, please contact the respective copyright owners.

2019-12-29

---

PDF generated using Haiola and XeLaTeX on 21 Feb 2024 from source files dated 29 Jan 2022
5bafea06-5eb3-574c-9054-5e4b38c21bbc